# Еўропа прапаноўвае абменьвацца… моладдзю



Нягледзячы на тое, што агульнаеўрапейская праграма «Моладзь у дзеянні» працуе ў Беларусі ўжо некалькі гадоў, яе ўдзельнікі не перастаюць здзіўляцца таму, наколькі яна дзейсная.

Насамрэч у Еўропе такія праекты ўжо даўно разглядаюцца як спосаб фармавання актыўнай грамадзянскай пазіцыі маладога пакалення, бо праграма грунтуецца на ўзаемаразуменні ды павазе і дапамагае ўзмацніць ролю моладзі ў грамадстве.

Праграма «Моладзь у дзеянні» працуе сёння ў трох кірунках: валанцёрства, трэнінгі ды развіццё сеткавага супрацоўніцтва і моладзевыя абмены. Адзін з такіх абменаў і прайшоў нядаўна ва Украіне.

Маладыя людзі з Польшчы, Беларусі і нашай паўднёвай суседкі вывучалі асаблівасці добраахвотніцкай дзейнасці і спецыфіку нацыянальнай культуры розных частак Еўропы. Гэтая паездка адбылася ў межах праекту «Ты патрэбны грамадству!».

Асноўным арганізатарам моладзевага абмену з беларускага боку выступіла грамадскае аб'яднанне «Фокус-група». Пра свае ўражанні ад паездкі распавядае адна з удзельніц праграмы, студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў **Алена Славіна**:

Нават не варта пытаць, ці патрэбныя такія праекты. Сістэма абменаў — гэта важны крок у разуменні іншай культуры, збліжэнні і без таго блізкіх па духу народаў, абмене досведам маладых людзей. І акрамя таго гэта выдатная магчымасць зрабіць свой вольны час актыўным і не проста добра адпачыць, але і атрымаць шмат задавальнення.

***Ці былі нейкія арганізацыйныя хібы ў гэтым праекце?***

Адзіны мінус — гэта мабыць тое што ў сустрэчы былі крыху размытыя мэты і задачы і, на мой погляд, гэта была проста спроба асягнуць неабсяжнае.

***Апішыце прыкладны «партрэт удзельніка» такога праекту?***

Гэта сучасныя, маладыя, актыўныя ды ідэйныя асобы, якія робяць усё магчымае, каб час не праходзіў проста так.

***Што больш за ўсё ўразіла?***

У сучасным грамадстве існуе мноства стэрэатыпаў пра маладое пакаленне, і часта гэтыя стэрэатыпы апраўдваюць сябе.

Такія праекты паказваюць нас, моладзь, з другога боку, даюць нам магчымасць самавыявіцца пры дапамозе сацыяльна важных і цікавых момантаў. Для мяне як для чалавека, цесна звязанага з культурай і мастацтвам, было проста неабходна прывезці гэты багаж эмоцый, навыкаў і ўменняў.

Плюс да ўсяго я змагла праверыць свае ўласныя ідэі.

***Ці дапамагаюць, на Ваш погляд, такія праекты зблізіць Беларусь з ЕС?***

Натуральна! Яны, па-першае, павышаюць узровень інфармаванасці пра тое, што адбываецца на прасторы ЕС для людзей з розных яе кропак.

І таксама важна адзначыць, што гэта добрая моўная практыка.

Акрамя таго, гэта магчымасць прэзентаваць сваю краіну, пагаварыць пра існыя стэрэатыпы і паспрабаваць развеяць іх на справе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ